БАЦЬКАЎШЧЫНА

14(58)

WHITERUTHENIAN WEEKLY „THE FATHERLAND"

Цана 30 н. фэн., для заграніцы — 50 н. ф.

№ 13(57) 30. ЧЫРВЕНЯ 1949 Г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 3

Сіла гэта шлях да перамогі

Парыская канфэрэнцыя — толькі дапаможны сродак да далейшага паразу меньня

Той факт, што праз некалькі гадзін пасьля павароту міністра замежных справаў ЗША Ашэсона з Парыжу прэзыдэнт Трумэн агаласіў аб выніках канфэрэнцыі міністраў замежных спраў, падкрэсьлівае значэньне, якое амэрыканскі ўрад надае канфэрэнцыі ў Парыжы.

»Урад Злучаных Штатаў, — сказаў прэзыдэнт, — ад шчырага сэрца вітае вынікі канфэрэнцыі ў дачыненьні да Аўстрыі«, і далей: »у дачыненьні да Нямеччыны, аднак, нельга таго самага сказаць. Трэба шчыра прызнацца, што ня гледзячы на імкненьне заходніх дзяржаваў да еднасьць, еднасьць гэтая па канфэрэнцыі асягнутая ня была.

Амэрыканская дэлегацыя ехала ў Парыж з намерам выпрацаваць канструктыўную праграму, якая-б з аднаго боку задавальняла патрабаваньне адзінай Нямеччыны, з другога боку — адказвала-б інтарэсам усіх чатырох, акупуючых Нямеччыну, дзяржаваў у іх імкненьні адбудаваць Нямеччыну на мірных, дэмакратычных асновах.

Адначасна, заходнія дзяржавы былі зэдыцьаванымі не ўвайходзіць ні ў якія кампрамісы, якія змушалі-б да адступленьнаў ад гэтых дэмакратычных асноваў, паводле якіх уже адбудоўвацца палітычнае жыцьцё ў заходняй Нямеччыне і па водле якіх павінна адбудоўвацца палітычнае жыцьцё ўсходняй зоны Нямеччыны. Яны ведалі, што ў гэтых дамаганьнях яны маюць падтрымку вольна выбраных прадстаўнікоў большасьці нямецкага народу.

Савецкі Саюз імкнуўся да звароту да Патсдаму і да тэй сыстэмы, якая ў выніку злоўжываньня саветамі права неабмежаванага вэта выказала сябе нязжыцьцяздольнай. Савецкая дэлегацыя не хацела прызнаць што ад 1945 году Заходняя Нямеччына зрабіла вялікі

Найлепшае, што магло быць зроблена ў гэтых абставінах, гэта выпрацавана ўмова, якая мае на мэце палегчыць становішча ў падзеленай Нямеччыне. Умова гэтая — толькі дапаможны сродак, каб палегчыць сучаснае становішча.

Вынікі парыскае канфэрэнцыі яшчэ раз падкрэсьліваюць неабходнасьць весьці і надалей нашую палітыку з поўным супакоем і станоўкасьцю, бо гэта адзін шлях да стварэньня ўмоваў, якія гвараантавалі-б супакой і волю у цэлым сьвеце!«

У дачыненьні да Аўстрыі прэзыдэнт сказаў: »ёсьць падставы спадзявацца, што дзяржаўная умова да канца бягучага году будзе падпісана. Гэткае дасягненьне было-б вельмі прыемным і аўстрыйскі народ прыме яго з задавальненьнем«.

Ангельскі міністар замежных справаў Эрнст Бэвін, пасьля прыбыцьця ў Лёндан, у размове з прадстаўнікамі прэсы падкрэсьлў значэньне новых пэрспэктываў, якія адчыняе канцовы камунікат парыскіх перамоваў для супрацоўніцтва:

«Вартасьць камунікату«, — сказаў Бэвін, »залежыць ад таго, як ягоныя тэзы будуць рэалізавацца. Фундамант створаны — мы мусім па ім цяпер далей будаваць. Я веру маім суседзям і спадзяюся, што яны таксама да нас давер маюць.«

Францускі міністар замежных справаў, Робэрт Шуман, падкрэсьліў, што пастанова аб утрыманьні надалей у моцы загаду аб зьнясеньні бэрлінскае блёкады зьяўляецца адной з больших прыкметаў адпружаньня.

»Гэты камунікат«, — сказаў ён, »выяўляе, што чатыры вялікія дзяржавы ў справе гаспадарчага і палітычнага аб'яднаньня Нямеччыны, а таксама і ў справе аднаго супольнага статуту для Бэрліну не дайшлі да еднасьці«.

Шуман падкрэсьліў факт, што, хаця ў камунікаце і няма выразнае пазытыўнае ацэнкі парадкаў у заходняй Нямеччыне, усё-ж Савецкі Саюз не выступае больш супраць гэтых парадкаў. »Так як мы прымаем да ведама рэжым у усходняе Нямеччыны, так Савецкі Саюз прымае да ведама рэжым Заходняе Нямеччыны.«

У дачыненьні да дзяржаўнае ўмовы з Аўстрыяй, Шуман паінфармаваў карэспадэнтаў аб тым, што акрэсьленьне паняцьця »нямецкая ўласнасьць« выклікала найбольшыя цяжкасьці.

Шматлікія аўстрыйскія багацьці, якія пасьля далучэньня Аўстрыі ў сакавіку 1938 г. да Нямеччыны перайшлі ў нямецкія рукі, ня гледзячы на прымусовасьць гэтага далучэньня, разглядаюцца саветамі выключна як нямецкая ўласнасьць. Спроба аб'яльня на гэтым пунцы выклікала бясконцыя дыскусіі.

У Белградзе прынятую канфэрэнцыяй ўмову у дачыненьні да Аўстрыі разглядаюць як »немчымы да прыняцьця Дыктат.« У камунікаце югаслаўскага міністэрства замежных справаў між іншым гаворыцца:

»Югаславія ніколі не зрачэцца тэрытарыяльных прэтэнсіяў і рэпарацыяў ў дачыненьні да Аўстрыі. Патрабаваньні Югаславіі, якая належыць да аб'яднаных нацыяў, ігнаруюцца, а адначасна замежныя міністры чатырох вялікіх дзяржаваў уважаюць за патрэбнае задаволіць савецкія дамаганьні звароту былой нямецкай уласнасьці, а таксама і іншыя прэтэнсіі Савецкага Саюзу.«

Крыжовая пяцігодка

Пяць год таму адгрымелі гарматы над нашай краінай. Спустошаная чужынецкай вайною Беларусь мусіла уздыхнуць на поўныя грудзі, выдыхаць чад вайны і ў вольнай, бязпрыгоннай працы загаіць крывавыя раны вайны.

Мусіла! Але так ня сталася... На зьмену азьвярэлага, крывавага, страшнага ў сваёй тупасьці ката — нямецкага нацызму, зноў вярнуўся ня менш люты, ня менш жудасны ў сваім азіяцкім бяздушны кат — маскоўскі бальшавізм.

Новы (а каторы па ліку!) крывавы акупант пачаў дарабляць тое, чаго не зрабіў перад трыма гадамі раней і чаго не пасьпеў яшчэ зрабіць ягоны папярэднік: — канчальнае спустошаньне краіны і фізычнае вынішчэньнё беларускага народу.

Сяньня чырвоны маскоўскі кат спраўлае свой пяцігадовы юбілей.

Сяньня чынушы ад Масквы пад мяпушкаю »урад БССР« будуць выслаўляць свае »вялікія дасягненьні.«

Чужыя і варожыя беларускаму народу Гусаравы, Клешчовы й Казловы, згвалтаваўшы дух і волю беларускага народу, ягоным-жа імём, будуць выносіць сабе падзяку за »ўмелае кіраваньне«.

Затурканыя, запалоханыя »спэцы« і тупыя калёніяльныя ўрадаўцы пад дыктату зьверху будуць укладаць невераголна — фальшывыя лічбы росту і дасягненьняў савецкага будаўніцтва, аб выкананьні і перавыкананьні сталінскіх плянаў аднаўленьнай краіны.

Купленыя бясрэрыпцыповыя чужынцы — „вучоныя напішуць навуковыя трактаты аб нячуваным, немагчымым у капіталістычных умовах, росьце і дасягненьнях савецкай навукі й тэхнікі пад геніяльным кіраўніцтвам.

Здэмаралізаваныя паэты й пісьменьнікі за скарынку хлеба й костку са стала банкетуючага захопніка, будуць, бэсьцячы свой народ і ягоныя традыцыі, апяваць »шчасьлівае й радаснае жыцьцё«, складаць оды »вялікаму« і »геніяльнаму«.

Створаныя ў габінэтах »парткомаў« і »прафкомаў« прайдохі — стаханаўцы будуць браць на сябе новыя працоўныя абавязацельствы, цягнучы ў яшчэ большую эксплёатацыю зьнясілены беларускі народ.

Будуць сходы, будуць сагнаныя маніфэстацыі, з плякатамі і лёзунгамі, будуць прамовы із словамі глыбокай адданасьці і шчырай падзякі. Будзе ўсё, што належыць да атрыбутаў тупой, трафарэтнай дыктатарскай прапаганды, разьлічанай на абыякавасьць і магільную маўчанку, бяз кроплі рэакцыі прыбітага, бяспраўнага народу — нявольніка.

Шматтысячная армія паразытуючых прапагандыстых мабілізуе ўсе сродкі, каб давесьць сьвету, якога шчасьця зазнала Беларусь у абыймах братняга рускага народу пад геніяльным кіраўніцтвам крамлёўскіх уладароў.

Так будзе выглядаць савецкі прапагандавы фарс.

Але як выглядае рэчаіснасьць? Што **запраўды** атрымаў беларускі народ за 5 год панаўпага ўладарства маскоўскіх дыктатараў?

Тысячы павешаных у першыя-ж дні прыходу »вызвольнікаў«. Тысячы прадстаўнікоў беларускае інтэлігенцыі — настаўнікі, аграномы, лекары, інжынеры, артысты — былі зьнішчаныя толькі за тое, што жылі і дыхалі.

Кат Украіны Кох — злоўлены

Агенцтва „Рэйтар" паведамляе, што брытанская вайсковая ўлада разам з нямецкай паліцыяй заарыштавала ў Гамбургу Эрыха Коха, калішняга „райхскамісара" Украіны. Пасьля развалу Нямеччыны ў 1945 г. ён зьнік бяз сьледу. Цяпер выявілася, што Кох жыў у Гамбургу пад фальшывым прозьвішчам Рольфа Пэргэра.

Украінская грамадзкасьць з гэтага выпадку можа толькі цешыцца, бо нарэшце такі і гэты кат Украіны дастане заслужаную кару за свае жахлівыя злачынствы над украінскім народам.

Мы, беларусы, таксама цешымся за сваіх братоў украінцаў і верым, што і другі кат, кат Беларусі Готбэрг таксама ня міне сваёй долі

Камітэт за вольную Эўропу

У ЗША наўстаў Камітэт за Вольную Эўропу. Старшыня Камітэту Джозэф Гру заявіў у сувязі з гэтым:

„Камітэт будзе выконваць канкрэтную падрыхтоўчую працу на той дзень, калі ўпадзе жалезная заслона. Ён будзе мець характар галоўнага штабу ўсходня-эўрапэйскіх эмігрантаў. Мы будзем дапамагаць кіраўніком эмігрантаў працягваць сваё змаганьне супроць камунізму, каб дачакацца таге дня, калі ўпадзе жалезная заслона, і ўсходняя Эўропа зможа распачаць разбудову вольнае дэмакратыі".

Гэты Камітэт ня мае афіцыйнага характару, але Міністэрства Замежных Справаў ЗША ведае пра яго паўстаньне й згаджаецца зь ягонай дзейнасьцю.

Яшчэ аб атамовай бомбе

У вабліччы Савецкага наступу на Далёкім Усходзе й немагчымасьцяй разумецца із Саветамі на дыплёматычнай арэне, — палітыкі й вайскоўцы разважаюць і спрачаюцца на тэму ці сапраўды атамовая бомба ёсьць адзіную рэчаю, што стрымлівае сяньня савецкую агрэсію, як цьвердзіць Чэрчыль? Адмірал Блендай, які стаяў на чале экспэдыцыі на Вікіні, дзе былі праведзеныя ведамыя ўсяму сьвету спробы з агамовую бомбаю ізноў кажа, што атамовая бомба ня будзе выраашальнаю зброяю ў будучай вайне, а толькі дапаможа выйграць яе. Ен цьвердзіць, што атамовую бомбаю ня ўдасца нам перамагчы вялікую сухазземную армію, а трэба спадзявацца, што Саветы, якія ніколі ня лічыліся з людзьмі, ні на момант не задумаюцца кінуць мільёны людзей на сьмерць у першыя-ж дні вайны.

Атамовая бомба, гэта не ахова на будучыню

Вашынгтон (АП) Яшчэ некалькі год і, магчыма, мы будзем перажываць канец эпохі атамовай таямніцы,« — сказаў міністар абароны Злучаных Штатаў Джонсон 21 чырвеня ў сваім выступленьні ў амэрыканскаў ваеннай акадэміі.

„Канец гэтае эры, — сказаў далей Джонсон, — адзначыцца выбухам атамвае бомбы, збудаванае ў адной з чужых краінаў. Пачынаючы ад гэтага дня амэрынская перавага будзе палягаць ужо толькі на большым запасе атамовых бомбаў, вытворчай магутнасьці, апэратыўнай хуткасьці і колькасьці патрэбных для бамбардыровак атамовымі бомбамі самалётаў».

У сувязі з гэтым міністар абароны паведаміў, што прэзыдэнт Трумэн дазволіў мадэрнізацыю двох найбольшых авіяносцаў. Гэныя параплавы маюць быць прыстасованы да транспарту, старту і спуску найцяжэйшых бамбавозаў. Кошт перабудовы аблічваецца на 80 міліёнаў даляраў.

Амэрыканская абарона, падкрэсьліў Джонсон, ня гледзячы на значныя разьбежнасьці ў поглядах, так добрая і так моцная, як ніколі.

Праваслаўная царква у Саветах

Паводле французскае прэсы праваслаўная царква ў Саветах мае ўжо вялікую „іерархію". Апрача патрыярха Аляксея, які ўзначальвае савецкую царкву, у склад яе ўваходзіць тры мітрапаліты, 72 епіскапы і 30 тысяч сьвятароў і іераманахаў, якія абслугоўваць 28 тысяч цэркваў. Ці належна абслугоўваюць яны вернікаў, лічбу якіх савецкія чыньнікі падаюць на 80-90 мільёнаў, а »Весьнік Маскоўскага Патрыярха« навет налічвае аж 150 мільёнаў!?

Як бы ў вадказ на гэтае пытаньне нядаўна надрукавана адно з апошніх казаньняў патрыярха Аляксея, дзе ён заклікае вернікаў шчыра маліцца за Сталіна. »Маючы на чале народаў Савецкага Саюзу такога гэнія, як Сталін,« кажа савецкі патрыярх, 'мы мусім штодзённа усклікаць: »Хай праслаўленае будзе імя Ягонае на векі вечныя, Амін!«

БЕЛАРУСКАЯ ВЫСТАУКА У СТАЛІЦЫ АУСТРАЛІІ

У г. Кэнбэрры пасялілася 12 новых беларусаў-эмігрантаў. Не ўважаючы на такую малую колькасьць, яны дружна распачалі нацыянальную беларускую працу, годна рэпрэзэнтуючы свой народ перад аўстралійцамі й іншымі народамі. Яны ўжо маюць свайго прадстаўніка ў інтэрнацыянальным клюбе ІМКА-ІВКА і прадстаўніка для сувязі з аўстралійскімі ўрадавымі ўстановамі.

Дзеля большага азнаямленьня аўстралійцаў із паняволенымі народамі Ўсходняе Эўропы Клюб ІМКА-ІВКА арганізаваў 28-га травеня ў вітрынах галоўнага гарадзкога магазыну інтэрнацыянальную выстаўку, у якой узялі ўдзел беларусы, украінцы, эстонцы, латышы, летувісы й палякі. Каронаи выстаўкі была вялікая карта Эўропы, на якой былі паказаныя межы Беларусі, Украіны, Эстоніі, Лацьвіі, Летувы й Польшчы зь іхнымі сталіцамі. Ад сталіцаў краёў ішлі каляровыя шнуры да сьцягоў кожнае нацыянальнае групы. На вялікім беларускім бел-чырвона-белым сьцягу прыгожа красавалася Пагоня й надпіс „Беларусь". Пад сьцягам — карта Беларусі. Ніжэй, на сьцяне й сталох, — экспанаты: ручныя вышываныя й саматканыя рэчы, драйляныя й мэталёвы вырабы, а таксама й шмат сучаснае беларускае прэсы з цэлае эміграцыі. Над экспанатамі — подпісы ў беларускай, ангельскай і францускай мовах. Прыгожы кошык з каласамі й васількамі сымбалічна аздабляў абраз Бацькаўшчыны.

За два дні выстаўку наведала вялікая колькасьць жыхароў Кэнбэрры, бліжэйшых да гораду паселішчаў і гасьцей зь іншых гарадоў Аўстраліі. Спаміж іх былі сэнатары й дыплёматычныя прадстаўнікі амаль з цэлага сьвету. Беларускай выстаўкай асабліва зацікавіўся аўстралійскі міністар іміграцыі сп. А. Калуэл, які падрабязна распытваўся аб гісторыі нашага краю, разглядаў карту Беларусі, цікавіўся нашай прэсай і экспанатамі, а ў канцы ля нашае выстаўкі сфатаграфаўся.

У вадзін з днёў выстаўкі ў вялікай салі сталіцы — Арбайт Галі быў зладжаны інтэрнацыянальны канцэрт. Саля канцэрту, як і выстаўка, была ўпрыгожана нацыянальнымі сьцягамі. На канцэрце міністар іміграцыі выступіў з прамовай, у якой заявіў, што Аўстралія задаволена із новых эмігрантаў і таму да чэрвеня 1950 г. прыме да сябе 110.000 эмігрантаў.

В. Клуніцкі.

*

Блізу мілён прымусова вывезеных за межы краіны беларускіх сялян і сотні тысяч імпартаваных у Беларусь прадстаўнікоў розных народаў Азіі, — што паводле маскоўска-бальшавіцкіх плянаў мае на мэце зьмяніць нацыянальнае абліччa краіны.

Пляновае бязупыннае вынішчэньне нацыянальнай інтэлігенцыі, прыдушэньне беларускае культуры, узмоцненая лютая русіфікацыя.

Сотні тысячаў сялян да гэтай пары пражываючых у зямлянках. Абязлюдненьне вёсак, дайшоўшае да таго, што на палёх працуюць толькі жанчыны дзеці ды старыя.

Спусташэньне зямлі, зьмяшэньне засеваў і жывёлагадоўлі — поўны упадак гаспадаркі, давёўшы краіну на 5-м годзе паваеннай адбудовы да голаду. Весткі, якія дайшлі да нас з Бацькаўшчыны — выяўляюць жудаснае сяньня нашага народу. Дабрабытная Белорусь, якая стагодзьдзямі корміць сваім хлебам Маскоўшчыну — сяньня вымірае з голаду.

Вось балянс сталінскай крыжовай пяцігодкі. Вось як у запраўднасьці выглядае паваенная адбудова Беларусі.

Духовае і біялёгічнае вынішчэньне беларускага народу з мэтою зьліквідаваньня яго як нацыі!

Беларускі эмігрант, якому лёс дараваў жыцьцё ў краінах свабоды, ні пры якіх абставінах ні на хвіліну не забывае пра сваю раскрыжаваную Бацькаўшчыну! Кажны крок, кажны рух ягоны будзе разьлічаны на яе ўратаваньне!

Так мусіць быць і так будзе!

Бо справа ідзе аб жыцьці і сьмерці нацыі.

ВЕСТКІ З БАЦЬКАУШЫНЫ

Вітушка шырыць змаганьне

60.000 партызанаў — пад сьцягам незалежнасьці

Паводле вестак, атрыманых Беларускім Інфармацыйным Бюро (БІБ), партызанская армія ген. Вітушкі ў апошнія месяцы значна пашырыла сваю дзейнасьць.

Ужо блізу паўгода цягнікі паміж Менскам і Воршай курсуюць вельмі нерэгулярна. Як прызнаюць прадстаўнікі расейскай вайсковай улады, толькі 50% рэпарацыйных даставаў дайшло да свайго месца прызначэньня ў Расеі. Рэшту транспартаў беларускія партызаны высадзілі ў паветра. У сувязі з гэтым саветы павялічаюць морскі транспарт.

Гэтыя весткі БІБ пацьвярджае абшырны рэпартаж б. нямецкага афіцэра Пэтэра А., зьмешчаны ў нямецкай газэце »Тэлеграф«. Падаем цікавыя для нас вытрымкі з гэтага рэпартажу:

»На вялікай прасторы, паміж марамі Балтыцкім і Чорным — ад Адра, Карпатаў і Днястра на захадзе аж да вышынаў Валдайскіх на ўсходзе стварыліся па заканчэньні вайны партызанскія арміі, што налічваюць сотні тысячаў людзей, якія ўпарта змагаюцца з бальшавізмам і ягоным рэжымам.

Беларусы, украінцы, палякі, летувісы, эстонцы і латышы твораць адналіты фронт змаганьня супроць савецкага захопніка.«

ЛЕГЕНДАРНЫ ГЭРОЙ

Далей аўтар рэпартажу Пэтэр А. піша аб сваім асабістым знаёмстве з Вітушкам.

„Вітушка — чалавек сярэдняга росту, крамяны з кучаравымі валасамі. Гэты сын беларускага настўніка штодня праводзіць із сваімім кіраўнікамі аддзелаў сітуацыйныя канфэрэнцыі. Ад розных неспадзевак яго ахоўвае варта — малапрыкметныя хлопцы. Удзень і ўначы яны заўёды напагатаве, пільнуючы ля радыёвых апаратаў тыпу „Добра" і „Цаэсар".

Вітушка ёсьць усюды і... нідзе. Заўсёды мае тысячы розных намысьлаў. За кароткі, параўнаўча, час здолеў ён згуртаваць навакол сябе блізу **50.000 партызанаў**. У недаступных лясох мае свае базы і складзішчы. Найчасьцей зьмяшчаюцца яны ў добра замаскаваных бункерах, якія ў свой час пабудавалі немцы ў Беларусі, Летуве і Усходніх Прусах. У цяжка дасутпных лясох каля Коўны, Ліды, Маладэчна і Баранавіч усякія акцыі ваенныя з боку савецаў ня маюць посьпеху, а выкрыцьцё гэтых бункераўсправа зусім немагчымая.

19 лютага г. г. савецкая радыёстанцыя падала вестку, што даўно шуканы „бандыта" Вітушка нарэшце злоўлены. Але ўжо праз дзьве гадзіны партызанскія кароткахвалёўкі здэмантавалі савецкае паведамленьне.

Вітушка зьяўляецца праваднікам „Беларускай Незалежніцкай Партыі." Толькі на абшарах паміж Коўнай і Берасьцем ён дыспануе 45-тысячным войскам, дасканала ўзброеным і забясьпечаным."

ЗБРОЯ З-ЗА МЯЖЫ

„Партызанскіы аддзелы ўвесь час папаўняюцца новабранцамі, якія ня хочуць служыць у савецкай арміі. З тае прычыны, што жыхарства ў краінах савецкай акупацыі жыве ў пастаянным страху перад высяленьнем у глыбіню Расеі, мясцовае жыхарства актыўна падтрымлівае парытзанаў, не ўважаючы на рэпрэсіі НКВД.

Сваю партызанскую дзейнасьць Вітушка ажыцьцяўляе, галоўным чынам, праз напады на савецкія транспарты. Ен мае даволі шырокія міжнародныя сувязі, часьціну найноўшай зброі ён атрымлівае з-за мяжы.

Калі бракуе грошай, аддзелы Вітушкі арганізуюць напады на банкі ў Коўні, Вільні або іншыя. Вельмі часта зьвязаному дырэктару банку пакідаюць паквітаваньне на забраную гатоўку. Савецкія ўрадоўцы мусяць пагадзіцца з фактам і прызнаваць гэтыя паквітаваньні, на якіх стаіць „службовая пячатка" — гатовы да скоку чорны кот."

ЖАУНЕРЫ ЗЕЙДЛІЦЦ СУПРОЦЬ ПАРТЫЗАНАУ.

Аддзелы Вітушкі пад агульным назовам „Чорны Кот", зматарызаваны, маюць палёвыя тэлефоны і радыёвыя станцыі — прыймовыя і надаўчыя.

Аўтар рэпартажу сьведчыць, што да часу яго вяртаньня назад у Нямеччыну апарацыі НКВД і бальшавіцкае ўлады супроць партызанаў мелі такі—ж посьпех, як і ў свой час апарацыі нямецкі супроць савецкіх партызанаў. НДКВ часта выкарыстоўвае розных правакатараў, якіх падсылае да партызанаў, але іх партызаны хутка выкрываюць і ліквідуюць.

Низдольная змагацца з партызанамі савецкая улада засылае ў беларускія лясы рэгулярныя панцэрныя аддзелы з жаўнераў т. зв. арміі Зейдліца. Самі расейцы ня маюць адвагі пранікнуць у лясныя гушчары і карыстаюць нямецкія дапаможныя аддзелы, якіх, не ўважаючы на савецкія запярэчаньні, шмат ёсьць у савецкай арміі, як дабраахвотнікаў".

Тык выглядае рэчаіснасьць. Так ідзе „мірная адбудова БССР" ў дружным калектыве братніх народаў, пад апекай „вялікага рускага народу".

ГОЛАД У БЕЛАРУСІ

Біб. Беларускае Інфармацыйнае Бюро за пасьлярэдніцтвам уцекачоў і беларускіх жыхароў ДП лягераў атрымала весткі аб пашырэньні голаду ў БССР. Жыхар лягеру Альтэнштадт сп. Х. пераслаў нам ліст, які ён атрымаў ад родных з Крывіцкага раёну, Маладэчанскай акругі. У лісьце пішуць, што як у іхным раёне, так і на ўсёй Беларусі лютуе голад і людзі пачалі пухнуць з голаду.

Падобны—ж ліст перасланы нам з лягеру Мэнхэгоф. У гэтым лісьце на ім сп. А. Р. сваякі зь вёскі К. Мазырскага раёну Менскае акругі пішуць, што ў іхнай мясцовасьці людзі масава паміраюць з голаду. Шмат якія калгасьнікі ўжо ад канца зімы ня бачаць хлеба. Паелі ўсе запасы, навет „насеньне гароднінь і тое патрушчана". Не ўважаючы на суровыя забароны, калгасьнікі патаемна забіваюць свае адзіныя каравёнкі.

Тое самае аб пашырэньні голаду ў Беларусі цьвердзяць і ўцекачы з-за жалезнай заслоны. Прычына голаду, як перадаюць, ёсьць леташні недарод збажыны і малы ўраджай бульбы ў БССР. Але савецкая акупацыйная ўлада не ўзяла пад увагу недароду і выпампавала ад калгасьнікаў усё, што сабрана з палеў. Усе калгасьнікі, за малым выключэньнем, вымушаныя былі жывіцца толькі із сваіх прысядзібных дзялянак і сяк-так, поўгалодныя, дацягнулі да канца зімы. Вясна прынесла масавы голад.

Сталіца і большыя гарады, між іншага, голаду не адчуваюць.

„ВОЛЬНАЕ СЛОВА"

Толькі цяпер стаўся дастунпым і шырэйшаму грамадзянству днямі выданы бюлетэнь Саюзу Беларускіх Журналістых „Вольнае Слова" № 1. Выданьне ратапарнае і прысьвечанае патрэбам журналістых. Рэдакцыйная Калегія новага выданьня сабрала ў ім матар'ялы, асабліва патрэбны для пачынаючага беларускага журналістага. Рэд. Калегія ўва ўступным артыкуле зазначае, што выданьне будзе служыць разгляду прафэсыйных пытаньняў працаўнікоў і фаховай асьвеце, але ніколі ня кіне змаганьня за вольнае беларускае слова і думку.

М. Карэнь падае пачынаючым сканцэнраваны лемантар, асабліва разглядаючы падыход да апісовага матар'ялу і самую тэхніку карэспандэнцыі, а таксама нармальныя вымаганьні рэдакцыяў. У артыкуле „Нашыя пільнейшыя заданьні журналістых" падкрэсьліваецца вялікае значэньне свабоднага слова ў сяньнешнім змаганьні за аднаўленьне самабытнасьці Бацькаўшчыны.

Вельмі цікавы І разьдзел вялікшае працы М. Вольнага „Беларускае часапісьменства" яшчэ нікім не закрананая часьціна гісторыі беларускае прэсы. Успамін М. Талачаніна аб папярэдніках СБЖ падае вельмі каштоўны й грамадзтву наяведамы матар'ял з гісторыі барацьбы за свабоднае слова. Падлягае шырэйшаму абгаварэньню і выкананьню прапанова А. А. і М. П. закранутая ў артыкуле „Неадкладная справа". У багатым разьдзеле хронікі шмат месца прысьвечана актуальнасьцям нашага культурнага жыцьця і кніжнаму пытаньню.

М. Кніжнік.

Эміграцыйныя справы

АМЭРЫКА ПРЫЙМАЕ 339.000 ДП

Згодна з афіцыйнымі паведамленьнямі, амэрыканская палата рэпрэзэнтантаў ухваліла дапусьціць у ЗША ня 205.000 ДП, як было вырашана папярэднім законам, а 339.000.

СЯМЕЙНЫЯ БЕЛАРУСЫ МОГУЦЬ ЭМІГРАВАЦЬ У АУСТРАЛІЮ

На беларускай выстаўцы ў сталіцы Аўстраліі Кэнбэрры беларускі прадстаўнік меў 28. 5. 1949 г. наступнае інтэрв'ю з аўстралійскім міністрам іміграцыі сп. А. Калуэл:

Міністар: Колькі ёсьць беларусаў-эмігрантаў у Аўстраліі?

Адказ: Каля 200 асобаў.

Міністар: А колькі беларусаў ДП жыве ў Нямеччыне?

Адказ: Звыш 10.000.

Міністар: Чаму-ж так мала беларусаў эмігруе ў Аўстралію?

Адказ: Мы маем шмат лістоў зь Нямеччыны, у якіх нам пішуць, што беларусаў зь сем'ямі не бяруць на эміграцыю ў Аўстралію, хоць жаданьне эміграваць сюды ў іх ёсьць вялікае. Магчыма, што аўстралійскія кансуляты ў Нямеччыне блытаюць беларусаў із белымі расейцамі, якіх Аўстралія да сябе ня прымае. Мы прасілі-б Вас усунуць гэтыя перашкоды, даўшы магчымасьць і сямейным беларусам эміграваць у Аўстралію.

Міністар: Я зараз-жа дам тэлеграму ў Бэрлін, каб беларусаў без усялякіх абмежаваньняў і зь сем'ямі прымалі на эміграцыю ў Аўстралію.

Увечары таго-ж дня міністар Калуэл у другі раз наведаў выстаўку й паведаміў нашага прадстаўніка, што ім ужо выслана абяцана тэлеграма ў Бэрлін і прасіў паведаміць аб гэтым беларускія арагнізацыі ў Нямеччыне, а таксама падаць аб гэтым у беларускай прэсе.

А.

ЭМІГРАЦЫЯ ПАЖВАВІЛАСЯ

Апошнім часам заўважаецца пажваўленьне эміграцыйнае акцыі ў беларускіх лягерах.

Толькі па двох беларускіх лягерах — Остэргофен і Віндзішбэргердорф за апошнія два месяцы выэмігравала ў розныя краіны сьвету 138 чал. У ЗША — 30 ч., у Аўстралію — 37, у Канаду — 14, у Вразылію — 20, у Нарвэгію — 4, у Аргентыну — 4, у Францыю — 9, у Англію — 7, Бэльгію — 7, і Вэнэцуэлю — 6 чал.

Чакае на транспарт — 78 чал.

АД БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА КАМІТЭТУ

З пераездам беларускага лягеру Остэргофен у Розэнгайм туды перанёс сваю сядзібу і Нацыянальны Камітэт, а дзеля гэтага беларусы [illegible] павінны зьвяртацца ва ўсіх нацыянальных і эміграцыйных справах на адрыс:
Weißruthenisches National Komitee
(13b) **Rosenheim** Pionier Kaserne
Weißruthenisches DP Lager

Чытайце «Бацькаўшчыну»!

Сталін шукае вінаватых

Молатаў мае замацаваць »братнія« расейска-кітайскія дачыненьні

Як паведамляюць з Парыскіх дыплёматычных колаў, Вячаславу Молатаву даручана прыпільнаваньне далёка ўсходняе палітыкі, а асабліва кітайскае справы. Выглядае на тое, што становішча расейскіх камуністаў у дачыненьні да кітайскіх „братоў“ мае хутка зьмяніцца ў замацаваньне расейска-кітайскіх дачыненьняў з камуністычным рэжымам у Кітаі. Распрацоўваецца вялікі плян падтрыманьня кітайскіх камуністых, як толькі будзе выбраны агульна-кітайскі камуністычны урад. Заданьнем расейскае камуністычнае партыі, а тым самым заданьнем Молатава будзе абаперці кітайскі камунізм цалкам на лініі традыцыйнага маскоўскага марксізму і гэтым самым, зрабіць немагчымымі згары ўсякія спробы якое колечы незалежнасьці. Калі-б Молатаву удалася гэтая новая місія і савецкія ўплывы расьцягнуліся-б на ўвесь Кітай, — на чарзе апынулася-б уся паўдзённая Азія аж да межаў Індыі, Бурмы, Галяндзкай Індыі і навет Філіпінаў — інакш кажучы пэрспэктыва пакаштаваньня радасьцяй »савецкага раю« пагражала-б агулам новаму 1 міліярду людзей! Але, як падаюць з тых-жа парыскіх колаў, цяжка спадзявацца аж гэткае ўдачы Молатавае місіі.

Дзейнасьць Захаду на Далёкім Усходзе не спыняецца, дарма, што кітайская справа ім прайграная. Вызначаная ўжо лінія, за якую расейскі камунізм не павінен пасунуцца. Гэтая лінія пачынаецца ад Японіі і цягнецца праз Фармозу, Філіпіны, француські Інда-Кітай, Сіям, Бурму і Індыю.

Амэрыканскі Генэральны Штаб зьвяртае таксама што раз большую ўвагу на Аляску, Бэрынгаў праліў і Алеуцкія абтокі, шукаючы базаў апоры савецкай агрэсіі. А 16-га чырвеня 1948 году амэрыканскі Кангрэс прыначыў аж 480 мільёнаў на разбудову абаронных ваенных амэрыканскіх базаў на Алясцы.

Саветы ізноў »адмаўляюцца«

Вашынгтон (СДП) Савецкі Саюз станоўка адмаўляецца даць якія-колечы весткі аб лёсе сотнаў тысячаў нямецкіх ваеннапалонных, якія яшчэ дагэтуль працуюць на савецкай катарзе. Амэрыканскае Міністэрства Замежных Справаў зварочвалася ўжо ці адзін раз да Саветаў з просьбаю інфармацыі аб лёсе гэтых людзей, звароту якіх дарэмна чакаюць родныя й сваякі. У кароткай ноце Савецкі Саюз сьцьвердзіў нядаўна адно, што ён ня бачыць патрэбы далей займацца гэтым пытаньнем.

Прыпамінаем, што на Маскоўскай Канфэрэнцыі 4-х украсавіку 1947 г. вялікія дзяржары дамаўляліся адпусьціць усіх ваеннапалонных з апошняе вайны да канца 1948 году. Але тады як і Амэрыка й Ангельшчына й Францыя парупіліся выканаць умову, Саветы ня толькі нічога не зрабілі ў гэтай справе, але яшчэ раз па разе спрабавалі ашукаць сваіх „саюзьнікаў“, падаючы непраўдзівыя лічбы і скідаючы усю віну за недатрыманьне ўмовы на Заходнія дзяржавы.

ЗРАЗУМЕЛІ

„Контынэнталь Нью Сэрвіс“ ня верыць, што заходнім дыплёматам удасца паразумецца із Вышынскім, у якой-колечы паважнейшай справе, бо, як цьвердзіць газэта, няма надзеі на тое, каб Савецкая Расея дазволіла краінам, апанаваным ёю на нейкія »палёгкі« ў рэжыме. Палітычная свабода палякаў, чэхаў, румынаў і інш., лібэральны курс у палітыцы, а навет у эканоміцы гэтых краінаў, немагчымы, бо калі-б савецкі рэжым перастаў быць абсалютыстычным, ён перастаў бы папросту існаваць.

Няўдалая рэвалюцыя ў Санто Домінго

(УП) Урадавыя колы рэспублікі Санто Домінго 21-га чырвеня паведамілі, што, пасьля няўдалае спробы перавароту, становішча ў краіне нармалізавана. 19 чырвеня на тэрыторыі рэспублікі спусьціліся два самалёты — амфібіі, з якіх паўстанцы распачалі акцыю супроць ураду прэзыдэнта Леонідаса Труільлё.

Паўстанцы, якія зьяўляюцца сябрамі гэтак званае »Караібскае Дэмакратычнае Акцыі« з галоўнай кватэрай у Гаване, паведамілі аб стварэньні гнёздаў супраціву. Паводле, аднак, урадавага камунікату, усе прыбылыя на лятаючых лодках паўстанцы адразу пасьля высадкі былі зьнішчаныя ўрадавымі войскамі.

Звыш 700.000 летувісаў вынішчана і дэпартавана

Нью Ерк Паводле асьветчаньня Гэнрыка Цэмэліса — прадстаўніка летувійскае рады ў Амэрыцы, за час новае савецкае акупацыі зьнішчана і вывезена звыш 700.000 летувісаў. Такім чынам нацыя стаіць перад пагрозай поўнага вынішчэньня. Цэмэліс пакінуў Летуву пасьля заканчэньня вайны. Перад прыбыцьцём у Амэрыку ён быў рэдактарам аднае летувіскае газэты ў Нямеччыне.

З прэсавае канфэрэнцыі IRO

З ЧАРГОВАЕ КАНФЭРЭНЦЫІ IRO

Больш свабодны характар, чым усе папярэднія, мела прэсавая канфэрэнцыя у Бад-Кісінген дня 17. 6. 1949. Асабліва ажывіла яе вымена думак між ДП журналістымі і наведаўшымі яе гасьцямі, 7-мі амэрыканскімі журналістым із Нью-Ерку, Чыкаго, Колёрадо, Нью-Ошэрсы, Тэнэсы, Канэктікэк, якія студыюць праблемы ДП, аб'яжаючы ДП лягеры Аўстрыі і Бавaрыі.

Амэрыканскіх калегаў зацікавілі, між іншага, такія пытаньні, як свабода слова ў ДП прэсе і свабода самае ДП прэсы, супрацоўніцтва і суадносіны ДП прэсы з нямецкім насельніцтвам, з амэрыканскай арміяй і з акупацыйнымі ўладамі. Адносна свабоды ДП прэсы было сьцьверджана, што яна не сягае далей чымся свабода нямецкае прэсы. Суадносіны зь нямецкім насельніцтвам трэба азначыць, як нэгатыўныя, а з амэрыканскай арміяй і з акупацыйнаю ўладаю — як пазытыўныя і прыязныя.

З чаргі ДП журналістыя ставілі запыты гасьцём. Адным зь іх было пытаньне: якое уражаньне робяць ДП у Амэрыцы? Трэба прызнаць, што усе адказы былі выключна пахвальнага зьместу. Было навет падкрэсьлена, што на справе ня здарыўся ніводзін сур'ёзны выпадак, які-б кідаў цень на апінію ДП у Амэрыцы.

Зь іншых пытаньняў, стаўленых без акрэсьленага парадку, важным для беларусаў была інтэрпэляцыя прадстаўніка Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў справе прычынаў недастатковa інтэнсыўнае эміграцыі беларусаў у ЗША. Шэф аддзелу інфармацыі сп. Рэйнэр запэўніў, што становішча беларусаў у гэтай справе нічым ня розьніцца ад становішча іншых нацыянальнасьцяў. Павялічэньне ліку эмігруючых залежыць ад 2-х дзейнікаў: 1. ад павялічэньня ліку прысыланых кантрактў на працу (ашурансаў) і 2. ад таго, як сябе беларусы пакажуць у Амэрыцы.

Спадар Гурбскі з Францыі даў шырокую інфармацыю аб новых палёгках і вялікіх выгадах для сем'яў, што хацелі-б выехаць на працу у Францыю, заклікаючы ДП скарыстац з гэтае нагоды.

П.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

— Іран. Урад ухваліў ліквідаваць іранскі кансулят у Баку, апошні іранскі кансулят, што быў да гэтага часу на тэрыторыі СССР.

— Нямеччына. У Мюнхэне адбыўся кангрэс каталіцкіх, юдзейскіх і пратэстанскіх вучоных, прысьвечаны справе супрацоўніцтва гэтых трох веравызнаньняў. На канфэрэнцыі прамаўляў таксама і гэнэральны сэкратар »міжнароднай рады хрысьціянаў і ізраэлітаў«, якая мае свой цэнтр у Жэнэве (Швайцарыя).

— Турэччына. Жонка калішняга савецкага пасланьніка ў Анкары адмовілася вярнуцца ў СССР. Савецкія агенты намагаліся вывезці яе сілаю, але гэтаму перашкодзіла турэцкая паліцыя. Не ўважаючы на настырлівыя дамаганьні савецкага ўраду турэцкі ўрад станоўка адмовіўся выдаць яе.

— Нарвэгія. Аб'еднаньне прафэсыйных саюзаў ухваліла выйныці з апанаванага камуністамі сусьветнага аб'еднаньня прафэсыйных саюзаў. Гэткую-ж пастанову яшчэ раней прынялі прафэсыйныя саюзы ЗША, Вялікабрытаніі, Галяндыі, Бэльгіі, Канады, ды Італіі. Прафэсыйныя саюзы Ізраэлю вырашылі пакуль што захаваць »нэўтральнасьць.«

Швэдыя. Загадам Камінформу у рэдакцыі органу швэдзкай камуністычнай партыі праведзена чыстка, у выніку якой **звольнены ўсе 15 сяброў рэдакцыйнай калегіі.**

Карэя. Вайсковая камуністычная група у паўночнай Карэі перайшла кардон паўдзённай Карэі. Паміж ёю і паўдзенна-карэйскім войскам трываюць зацятыя бai. Прэзыдэнт Турмэн зьвярнуўся да Кангрэсу з лістом, у якім просіць прызначыць для Паўдзённай Карэі такую-ж матарыяльную дапамогу, якую дастае Эўропа паводле »пляну Маршаля.«

Узмоцненыя штрайкі ў Італіі

Рым (УП) З прычыны адцягваньня выплаты дапамогі беспрацоўным маракам, пратэстацыйны штрайк апошніх з Гэнуі пашырыўся на іншыя італійскія парты. У некаторых з іх дайшло да сутычак. Штрайк сельскагаспадарчых рабочых згодна з распараджаньнем прафэсыйнага саюзу ўзмоцніўся, ставячы пад пагрозу жніво на прыватных маёнтках. Паводле ацэнкі прэсы страты, выкліканыя гэтым штрайкам, роўны 700.000 тонаў збожжа коштам на 10 міліёнаў доляраў.

БНР У ДАКУМЭНТАХ

(Працяг. Гл. № 13 (57)

НОТА ПРАТЭСТУ МІНІСТЭРСТВА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ У СПРАВЕ ДАЛУЧЭНЬНЯ АУГУСТОУСКАГА ПАВЕТУ, СУВАЛЬСКАЕ АКРУГІ ДА ПОЛЬШЧЫ.

„Да Міністра Замежных Справаў Полькае Рэспублікі.

У сувязі з абвешчаньнем польскім урадам выбараў у Польскі Уставадаўчы Сойм у этнаграфічна й гістарычна беларускіх паветах Беласток і Бельск, Рада Міністраў Беларускае Народнае Рэспублікі перасланa 15-га сьнежня 1918 году на імя Міністра Замежных Справаў Польскае Рэспублікі ноту пратэсту супроць гэтага акту, які ёсьць роўнавартасны із анэксыяй часткі беларускае прасторы і парушае сувэрэнныя правы беларускага народу да ягонае тэрыторыі. Жадаючы ўтрыманьня добрасуседзкіх дачыненьняў із польскім народам, Рада Міністраў зазначае пры гэтай нагодзе, што захаваньне ў моцы тае часткі дэкрэту Польскага ўраду у справе выбараў у Польскі Уставадаўчы Сойм, якая датычыць, Беластоцкага й Бельскага паветаў, можа мець вельмі дрэнныя, вынікі ў галіне беларуска-польскіх узаемадачыненьняў, адказнасьць за што падае цалкам на Польскі Урад.

Не зважаючы на гэты пратэст, Польскі Урад ня толькі не зрабіў аніякіх крокаў да адкліканьня свайго няпраўна выдадзенага акту, але новым актам парушыў навет прыродныя правы беларускага народу да самавызначэньня і непадзельнасьці ягонае тэрыторыі. Гэткім актам ёсьць новы дэкрэт Польскага Ураду, пададзены да агульнага ведама польскаю прэсаю, у справе далучэньня да Польшчы беларускага павету Аугустова, Сувальскае акругі.

Аўгустоўскі павет паводле бальшыні свайго насельніцтва бясспрэчна беларускі, што сьцьверджана як урадавай статыстыкай, так і бясспрэчнымі навуковымі этнаграфічнымі аргумантамі; апрача гэтага павет гэты рэзка аддзелены ад Польшчы таксама й прыроднымі межамі. У анэксіі гэтае новае часткі беларускае прасторы Рада Міністраў Беларускае Народнае Рэспублікі бачыць выраз польскае імпэрыялістычнае палітыкі, якая супярэчыць правом народаў да самавызначэньня й элемэнтарным падставам дэмакратыі.

Узьнімаючы якнайэнэргічнейшы пратэст супроць гэткае палітыкі, якая сыстэматычна парушае сувэрэнныя правы Беларускае Народнае Рэспублікі, Рада Міністраў перасьцерагае Польскі Урад і паведамляе, што, адначасна із гэтаю нотаю супроць гвалтаў Польскае Рэспублікі над Беларусяй, высылаецца пратэст да Вялікіх Дзяржаваў із просьбаю узяць на сябе абарону інтарэсаў беларускага насельніцтва й непадзельнасьці Беларусі.

Старшыня Рады Міністраў БНР і Міністар Замежных Справаў

А. Луцкевіч.

2 Студзеня 1919 г. Горадня“.

(Аўген фон Энгельгардт „Вайсрутэніен“, б. 322).

НОТА ПРАТЭСТУ УРАДУ БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ НА МІРНУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ У ПАРЫЖЫ ДА УРАДУ ЛЕТУВЫ, ПОЛЬШЧЫ, РАСЕІ Й НЯМЕЧЧЫНЫ (1919).

„У 40-ым нумары газэты „ЭХО“ ад 30-га студзеня 1919 году перадрукаванае паведамленьне „Рады Начальней Земі Гродзеньскей“, якое загадвае польскім жыхаром г. Горадні ўзяць удзел у выбарах прадстаўнікоў у Польскі Уставадаўчы Сойм у Варшаве. Выбары вызначаюцца на 1-га лютага 1919 году.

У сувязі з тым, што

1. Паводле існуючых канстытуцыяў усіх дзяржаваў выбары ваўставадаўчыя ўстановы праводзяцца толькі ўнутры дзяржаўнае прасторы тае дзяржавы, якая выбірае свае ўстарадаўчыя органы і што

2. Паводле існуючых інтэрнацыянальных канвэнцыяў ніводная дзяржава ня мае права праводзіць выбары ў свае ўставадаўчыя ўстановы на тэрыторыі чужое дзяржавы, што

3. Выбары ў Польскі Уставадаўчы Сейм у Варшаве могуць быць праведзены толькі на тэрыторыі Польшчы паміж грамадзянамі Польскае дзяржавы, што

4. Горадзеншчына ёсьць прастораю, якая на працягу гісторыі была заселеная беларусамі, якія складаюць тут 71% усяго насельніцтва і ніколі не прызнавалі Польскай дзяржаве ніякіх сувэрэнных правоў да Горадзеншчыны ў межах Горадзенскага Губэрнатарства 1914 г., не прызнаючы іх ёй і сяньня, што

5. Палякі. якія складаюць толькі 10% агульнае лічбы насельніцтва Горадзеншчыны не даюць Польскай дзяржаве найменшага права на Горадзенскі Край адно з прычыны, што яны жывуць у нашай краіне, што

6. Згодна з рэзалюцыяй Кангресу беларусаў Горадзеншчыны, які адбыўся ў Горадні 1-га сьнежня 1919 г. і пастанавіў, што, маючы на ўвеце дамаганьні Польшчы, Горадзеншчына далучаецца да Летувіскае дзяржавы на асновах шырокае аўтаноміі і Горадзенскія ўлады пераймаюць ахову ўсіх палітычных правоў і інтарэсаў насельніцтва, — Управа Горадзенскага Беларускага Губэрнатарства ўзьнімае энэргійны пратэст супроць абвешчаньня выбараў прадстаўнікоў у Польскі Сойм палякамі Горадзеншчыны.“

Падпісалі: Заступнік Старшыні Усевалод Боеў, за сакратара сябра Управы: Юргель.

(Аўген фон Энгельгард „Вайсрутэніен“, б. 334).

Зь Беларускага Жыцьця

ДРУГІ ЗЬЕЗД

Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне.

29-га травеня сёлета ў сталіцы Аргентыны Буэнос-Айрэсе адбыўся 2-гі Зезд Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне.

Зьезд адчыніў уступнай прамовай Старшыня Згуртаваньня сп. К. Мерляк. У Прэзыдыюм Зьезду былі выбраныя: сп. С. Камар — на старшыню, сп. Ц. Клімовіч — на сакратара й сп. А. Грынкевіч — на сябру.

Старшыня Зьезду, сьцьвердзіўшы, што Зьезд скліканы згодна із Статутам Згуртаваньня й штe ўсе прынятыя ім пастановы будуць абавязваць усіх сяброў арганізацыі, перайшоў да парадку дня: 1. Справаздача зь дзейнасьць кіруючых органаў Згуртаваньня, 2. Прапазыцыі папраўак у Статут Згутараньня, 3. Выбары новых кіруючых органаў Згуртаваньня, 4. Плян працы на 1949-50 год, 5. Вольныя прапазыцыі.

Справаздачу з агульнае дзейнасьці Згуртаваньня за час між 1-ым і 2-ім Зьездамі апганізацыі злажыў Старшыня Згуртаваньня сп. К. Мерляк, фінансава-гаспадарчую справаздачу — сп. М. Ланкевіч. Пасьля гэтага разгарнулася дыскусія аб працы Згуртаваньня й ейнае Управы. У канцы дыскусіі Старшыня Наглядная Рады адчытаў Зьезду пратакол рэвізіі працы Управы й запрапанаваў вынесьць ёй абсалютoрыюм з падзякаю за праробленую працу. Прапазыцыя была прынятая аднагалосна.

Пасьля ўнясеньня вымаганых жыцьцём Згуртаваньня папраўак у Статут Зьезд прыступіў да выбараў новае Управы й Нагляднае Рады. На Старшыню Управы быў зноў выбраны сп. К. Мерляк, Апрача яго, да Управы ўвайшлі: сп. сп. інж. Ф. Фамін, І. Гейхрох, М. Ланкевіч і Ч. Юзэровіч. У Нагляднуе Раду выбраныя: сп. сп. О. Гейхрох, С. Камар і М. Лазюк.

Затым быў абмеркаваны й прыняты плян працы Згуртаваньня на 1949-50 год. Плян прадбачае ўзмацненьне нутраное арганізацыйна - нацыянальнае працы Згуртаваньня сярод беларускіх эмігрантаў у Аргентыне, а таксама й актывізацыю прапаганды нацыянальнае беларускае праблемы сярод іншых народаў.

У вольных прапазыцыях былі прынятыя прывітальныя тэлеграмы Прэзыдэнту Аргентыны ген. Пэрону, Прэзыдэнту БНР інж. М. Абрамчыку й Старшыні Сусьветнага Аб'яднаньня Беларускае Эміграцыі інж. Л. Рыдлеўскаму. Сваю працу Зьезд закончыў адсьпяваньнем Беларускага Нацыянальнага Гімну.

Дэлегат.

4-ТЫ ВЫПУСК МАТУРЫСТЫХ ГІМНАЗІІ ЙМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

14-га травеня г. г. беларускі лягер Віндзішэргердорф урачыста адзначыў важную падзею ў эміграцыйна-лягерным жыцьці — чацьверты выпуск новых маладых грамадзян з закончанай сярэдняй асьветай.

Гэты, на першы пагляд звычайны факт, у абставінах чужыны набірае асаблівага значэньня. Пры нашай расьцярушанасьці па чужых краёх і невялікай колькасьці ідэйна-сьведомых ды узброеных неабходнымі ведамі людзей, кажная новая ды яшчэ маладая адзінка прымаецца з радасьцю й надзеяй на тое, што й тут на эміграцыі расьце й павялічваецца зьмена старэйшым.

Аднача́сна з гэтым неабходна зацеміць, што й Беларуская Гімназія ймя Янкі Купалы, не ўважаючы на ненармальныя ўмовы працы, дзякуючы самаахвярнасьці ейнага кіраўніка — дырэктара д-ра А. Орсы і ўсяго пэдагагічнага пэрсаналу за гэтыя 4 гады свайго існаваньня вырабіла ўжо свае традыцыі й імя сярод беларускага эміграцыйнага грамадзянства ў Нямеччыне.

Выпуск новых матурыстых — [illegible] ці юнакоў, пасьпяхова кончыўшых сярэднюю школу, як і заўсёды ў гімназіі імя Янкі Купалы адбыўся ў цёплых і ўрачыстых абставінах у прысутнасьці бацькоў, матурыстых, настаўнікаў і шматлікіх гасьцей.

Пажадаем новым нашым сябрам у змаганьні спорай працы, сілаў і здароўя у новым этапе іхнага жыцьця!

Бацька.

ПЕРАЕЗД ЛЯГЕРАУ

З прычыны ліквідацыі Арыі Амбэрг беларускія лягеры Остэргофэн і Віндзішэргердорф перанесеныя ў Розэнгайм, дзе створаны новы беларускі лягер. Туды-ж пераехала і беларуская група з лягеру Шлёсгайм. Цяпер лягер у Розэнгайме налічвае пакуль 950 жыхароў.

Тут месяцца і цэнтральныя беларускія установы, як Беларускі Цэнтральны Камітэт, Рэдакцыя газ. „Бацькаўшчына“ Зонны Камітэт ды інш.

Жыцьцё на новым месцы пакрысе наладжваецца. Распачынаюць перапыненую ў сувязі з пераездам працу кусы ангельскай мовы на 80 слухачоў. Рыхтуецца да працы аб'ядназная (Остэргофэн-Віндзішэргердорф) гімназія імя Янкі Купалы. Мастацкія сілы лягеру падрыхтоўваюць „тыдзень беларускай культуры.“

РЭФЭРАТ ДЛЯ УКРАІНЦАУ

У нядзелю 8-га травеня ў вялікай салі Саюзу Украінцаў Вялікабрытаніі ў Лёндане праф. Жук-Грышкевіч прачытаў для украінцаў рэфэрат аб беларускім нацыянальна-вызвольным руху. Рэфэрат, які выклікаў вялікае зацікаўленьне сярод слухачоў, спрычыніўся да яшчэ большага замацаваньня прыязных беларуска-украінскіх дачыненьняў ў Вялікабрытаніі.

„Беларус на Чужыне“.

Іван Ермачэнка робіць кар'еру

Трохі ведамы няшырокаму нашаму грамадзянству за часоў апошняе вайны др. Іван Ермачэнка, сяньня праз нейкі спрытны фокус трапіў у Амэрыку. Там, на матар'яльнай базе б. беларускай самапомачы ў Менску, ён пачынае „рабіць кар'еру“, як прадстаўнік БЦР.

Беларускі нацыянальны рух мала цікавяць Ермачэнкі. Шмат іх блыталася, а яшчэ й сяньня блытаецца пад нагамі здаровага нацыянальнага поступу, але часта гэтыя палітычныя авантурнікі досыць-ткі назаляюць і ў пэўных умовах могуць быць шкоднымі.

Карыстаючы спрыяльныя для сябе на сяньня ўмовы ў Амэрыцы, такі авантурнік Ермачэнка афішуецца там, за адзінага прадстаўніка беларускае эміграцыйнае грамадзкасьці, пралазіць у тамтэйшыя грамадзкія ўстановы, як нашых суседзяў, так і ў амэрыканскія, уводзіць людзей у зман і гэтым кампрамітуе беларускі нацыянальны рух. Мала таго, у пагоні за папулярнасьцю ён уваходзіць у сувязі з сумнёўнымі людзьмі, узводзіць паклён на беларускую эміграцыю і гэтым, нібы па чыімсьці загаду, перашкаджае масавай беларускай эміграцыі ў Амэрыку.

Вось прыклад. Перад намі 28 нумар расейскага часапісу пад дзіўным назовам „Дело труда — пробуждение“, які нам зычлівыя людзі надасладі з Нью-Ерку. Часапіс ёсьць „органам аб'яднанай фэдэрацыі расейскіх рабочых арганізацыяў ЗША і Канады“. На бал. 36 мы чытаем наступнае:

„**Нью-Ерк, Н. И.** — Глубокоуважаемый г. редактор! Приношу сердечную благодарносьць за высылаемый Ваш интересный журнал „ДТП“, который я пересылаю в наши беларуские лагери в Германии. Его появление среди беларусского трудового населения лагерей было встречено с большим интересом. Удивлятся этому нельзя п. ч. его содержание, не может не вызвать чуства радости, а его идеи являются для многих отровением. Желаю Вам успеха в плодотворной работе.

С совершенным почением

Др. И. Ермаченко.“

Цяпер паглядзімо, якое-ж гэта „откровение“ выклікае „чуство радости“ у „трудового населения“ беларускіх лягераў.

На бал. 25 чытаем:

„Прававерныя палякі — заядлыя каталікі, ненавідзяць савецкі бальшавізм і блізу ўсе варожа ставяцца да расейцаў, якіх называюць „Іванамі“, разумеючы пад гэтым дурняў Сярод іх разьвіты войстры нацыяналізм. Украінцы-ж падзяляюцца на заходніх і ўсходніх. Сярод заходнікаў разьвіты таксама войстры нацыяналізм і нянавісьць да расейцаў і палякоў... Сярод усходніх украінцаў ёсьць шмат такіх якія заразіліся сьляпым нацыяналізмам, і як і заходнія ўкраснцы, ненавідзяць расейцаў...“

„Калі з гэтымі людзьмі розных нацыянальнасьцяў **загаворыш пра сзабодны камунізм, то яны адразу абзываюць цябе „сазецкім шпіёнам“, бо па сваёй ненавісьці да бальшавізму, які называе сябе „камунізмам“, яны ў сьлепаце не адрозьніваюць дзяржаўнага „камунізму“ ад вольнага, запраўднага камунізму“**... (падкр. намі).

На бал. 26 знаходзім такія радкі:

„Пара ўжо адкінуць **гэтую шкодную арганізацыю чалавечага грамадства — дзяржаву і эмагацца не за зьмену аднаго уладара другім, а за самакіраваньне, за поўнае вызваленьне ад экслёатацыі чалавека чалавеку, за безуладнасьць.**“

На бал. 7 часапіс ганарыцца посьпехам сваіх аднадумцаў у бальшавіцкай рэвалюцыі 1917 г.

„Вядома, якую ролю у расейскай рэвалюцыі адыгралі анархісты. Яны былі ў першых радох народнага руху, бо рэвалюцыя ішла **анархічным шляхам** і адказвала асноўным запатрабаваньням ідэі бездзяржаўнасьці.“

Пададзеных цытатаў досыць, каб паказаць, якое „отп[illegible]овение“ крые ў сабе часапіс. Але-ж камунізм, хай сабе ён будзе і самым запраўдным, ніяк ня можа выклікаць „чувства радости“ сярод „трудового населения“ беларускіх лягераў, якое, рынуўшы ўсё перад жахам камунізму, ўцякло ад яго на Захад і гатоўа далей уцякаць, хоць к чорту ў зубы.

Цяпер узьнікае пытаньне, із якой мэтай зьмяшчаў Ермачэнка свой удзячны ліст у анархічна-камуністычным часапісе? Як нам добра ведама, ніводзін з беларускіх лягераў ніколі не бачыў гэтага часапісу. Навошта-ж Ермачэнка ўзводзіць паклён на беларускую эміграцыю, насьвятляючы яе ў вачох амэрыканскага грамадзянства, як прыхільніка камуністычных ідэяў? Ці гэта ёсьць звычайны ход палітыкана-пралазы, які ў пагоні за папулярнасьцю пнецца ў кожную дзірку, ці гэта ёсьць проста правакацыя?

У кажным разе блытаньне пад нагамі робіцца ўжо шкодным і нашым цэнтральным нацыянальным установам на эміграцыі пара спыніць далейшы ход „кар'ерь [illegible] палітычнага авантурніка Ермачэнкі, бо ягоны палітычны фарс можа мець непажаданы фінал. **А. Глыбоцкі.**

АБВЕСТКА

ЦБСА на Чужыне просіць усе беларускія выдавецтвы на чужыне прысылаць па 3 экзэмпляры сваіх выданьняў на адрыс:

L'Union Centrale des Organisations Estudiantinnes Bielorussiennes a l'Etranger 8, Place Hoover, Louvain. Belgique.

Гэтыя выданьні будуць рассылацца ў бэльгійскія бібліятэкі, каб у такі спосаб прычыніцца да папулярызацыі беларускае правы [illegible] для захаваньня слядоў дзейнасьці нашае эміграцыі на доўгія часы.

Старшыня БСЗ.

Шукаюць

Пратосаву Веру, Надзю й Рыгора шукае Раговіч Піліп. Паходзіць зьвёскі Граб'ё, Полацкага павету. Весткі кіраваць на адрыс:

F. Rahowicz, CNR. Extra gang No. 48, Foleyet, Out.

Ад Рэ[illegible]акцыі

Рэдакцыя і ад[illegible]істрацыя газэты „Бацькаўшчына“ [illegible]е да ведама свой новы адрыс:

Weißruthenische Z[illegible]ng „BACKAUSCYNA“ (13b) **Rosenh[illegible]** Weißruthenisches DP Lager

Рознае

У Крамлі ўчадзелі

Савецкі ўрад прыслаў Швэдыі вымогу зараз-жа перадаць у Савецкі Саюз.. дзьве гарматы, якія швэцкае войска здабыло ад маскоўскага войска ў 1581 г. у Івангородзе. Як паведамляе швэдзкая прэса, урад тымчасам ня мае замераў аддаваць гэтыя гарматы, якія ўжо блізу 400 год аздабляюць уваход у замчышча Грыпсгольм.

Запра[illegible] [illegible]могі падобнай да савецкай, із [illegible] [illegible]зай галавой ня выдумаеш.

[illegible] пралыпалі

У Баварыі мусілі зачыніць 30 турмаў з нястачы „кліентуры“

Хоць баварцў і ўважаюць за практычны народ, але гэтым разам яны пралышалі Замест таго, каб зачыняць патрэбныя установы і праз гэта расьцярваць і так доўгія хвасты беспрацоўных, лепш было-б здаць вольныя турмы ў арэнду сваім камарадам з Усходняе Зоны.

Там, як мы даведаліся, не хапае не вязьняў, а турмаў...

З ВЫДАВЕЦКАЙ НІВЫ „МЭДЫЧНАЯ ДУМКА“

У канцы красавіка г. г. Аб'еднаньне Беларускіх Лекараў на Чужыне выдала на ратататары 2-гі нумар свайго органу „Мэдычная Думка“. Часапіс абыймае 88 бачын і зьместам сваім уносіць ладную долю ў разьвіцьцё [illegible]скарскай мэд. літаратуры. Побач ар[illegible]гінальных працаў з галіны модыцыны [illegible]а праф. М. Сяргеева, Д-ра Я. Мал[illegible]ага і іншых, на асаблівую ўвагу [illegible]уговываецць артыкул сп. М. Рагаз[illegible]д наз. „Паленьне чараўнікоў у Бел[illegible]і на пачатку XУII ст. які быў у сво[illegible] чытаны на II-гім агульным зьезьд[illegible]караў у Марбургу.

Таксама аграмаднае грамадзкае значэньне мае передрук з Менскіх выданьняў „Номіна Анатоміка Альбарутэніка“ і зацемкаў да гэтага Н. Альгердзіча. Адно толькі, што пакуль не вядома пішучаму, якой номэнклятуры трымацца паводзе менскага укладу, ці паводле зацемак Альгердзіча, бо ёсьць часам разыходжаньні. Трэба спадзявацца, [illegible] на наступным, трэцім, зьезьдзе беларускіх лекараў справа гэтая будзе шырока абмеркаваная і канчальна ўстаноўленая беларуская лекарская номэнклятура.

Заганай часапісу ёсьць нявыразны друк. Цэлаць аднак, ролць прымнае ўражаньне, яна выразна адбівае творчую працу нашых лекараў. **Я. Л.**

„НАБАТ“

Выйшаў з друку № 1—2 (11—12) за 1949 г. часапісу „Набат“ — орган Камітэту Антыбальшавіцкага Блёку Народаў. (АБН). У нумары апублікаваны матар'ялы 2-га Кангрэсу АБН. Спасярод гэтых матар'ялаў — тэзісы двух дакладаў беларускіх дэлегатаў Кангрэсу — сяброў АБН ад Беларускага Нацыянальнага Цэнтру (БНЦ): 1. Міжнародная палітычная сытуацыя й чарговыя заданьні АБН і 2. Заданьні АБН у галіне палітычнае інфармацыі. Тут-жа зьмешчаны Маніфэст Кангресу, Рэзалюцыя ў справе г. зв. „Комітета Освобождённых Народов России“ і цікавыя інфармацыі з нацыянальна-вызвольных рухаў паняволеных Расеяй народаў. Цана нумару 80 фэн.

РЭДАГУЕ [illegible]ЛЕГІЯ

Whiteruthenian We[illegible] **„The Fatherland“** Autohrized by EUCO[illegible] Hq. Civil Affairs Division 1. January 194[illegible] [illegible] UNDP 225. Circulation 3500 copies. [illegible]ninistration: (13b) Rosenheim, Obb., W[illegible]uthenian, DP. Cp. **Resposible Publish[illegible]** [illegible]Vladimir Bortnik. **Printed by: Georg Ja[illegible]** **München 8, Pütrichstra[illegible]a.**